У сувязі з ростам нацыянальнай самасвядомасці асаблівую актуальнасць набывае далучэнне дзяцей  і падлеткаў да традыцый нацыянальнай культуры. Любоў да Радзімы выпрацоўваецца паступова ў працэсе назапашвання ведаў аб грамадскім жыцці, працы людзей на карысць дзяржавы, прыродзе. Далучэнне да нацыянальнай культуры неабходна пачынаць з дзяцінства, калі закладваюцца асноўныя паняцці і прыклады паводзін, асноўныя маральныя каштоўнасці: дабро, сумленне, гонар, дружба, узаемадапамога, працавітасць. Дзецям неабходна ведаць і вывучаць традыцыі і гісторыю свайго народа, культуру сваіх продкаў, паколькі зварот да бацькоўскай спадчыны выхоўвае павагу, гонар за зямлю, на якой жывеш.

Адметнай формай культуры з’яўляецца мова, якую народ абавязаны шанаваць і аберагаць. Выхаванне патрыятызму праз роднае слова, засваенне беларускай культуры – шматгранны працэс, у аснове якога ляжыць пашана да роднай мовы як галоўнага духоўнага здабытку. Далучэнне да чытання падрастаючага пакалення, выхаванне любові да беларускай літаратуры і мовы – адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці бібліятэк. Пры рабоце з моладдзю патрэбна выкарыстоўваць не толькі традыцыйныя, але і сучасныя формы работы:  завочныя падарожжы, віртуальныя экскурсіі, квэсты, гульні і інш. Каб узмацніць і пашырыць цікавасць чытачоў, пераключыць іх увагу да кнігі, ад кнігі – да творчасці аўтара, можна экранізаваць матэрыял.

Асаблівае месца ў рабоце па прапагандзе беларускай літаратуры займае індывідуальная работа. Выявіўшы цікавасць чытача да той ці іншай тэмы, аўтара, жанру, можна падабраць некалькі кніг, блізкіх па тэматыцы да інтарэсаў карыстальніка. Пры гэтым неабходна ўлічваць яго ўзрост, узровень адукацыі, чым выклікана цікавасць, чым падабаецца аўтар, кніга, тэма. Гэта дасць магчымасць пераключыць увагу чытача ад твора да творчасці аўтара ў цэлым або да іншых кніг гэтай тэматыкі.

Свята роднай мовы – важная падзея, якая адзначаецца штогод 21 лютага. Да гэтай знамянальнай даты можна арганізаваць тыдзень роднай мовы, у рамках якога прапанаваць карыстальнікам шэраг цікавых мерапрыемстваў, кніжна-ілюстраваных выстаў, фотазон і іншых пляцовак у залах бібліятэк. Абавязковым атрыбутам такіх мерапрыемстваў павінны стаць кнігі са шматлікімі матэрыяламі пра беларускую мову, яе станаўленне сярод іншых моў, галоўных дзеячаў, якія паўплывалі на яе развіццё.




Вялікую ролю ў далучэнні дзяцей і падлеткаў да беларускай літаратуры і беларускіх твораў адыгрываюць мерапрыемствы да знамянальных дат і значных падзей культурнага жыцця краіны. Гэта могуць быць тыдні і дні кніг,  вечарыны да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, агляды іх

жыццёвай і літаратурнай дзейнасці, творчыя партрэты, гучныя чытанні. Знаёмства з жыццём і творчасцю пісьменнікаў дапамагае лепш зразумець мастацкую праўду твораў, прыгажосць мовы, глыбіню думак і пачуццяў.

Моладзевай аудыторыі бібліятэк можна прапанаваць шэраг анлайн-мерапрыемстваў: арганізаваць сеткавую акцыю, літаратурны марафон альбо чэлендж. Падлеткам патрэбна прачытаць радкі з любімых твораў і параіць сваім равеснікам кнігі, якія найбольш іх зацікавілі. Падчас правядзення анлайн-конкурса “Фатаграфія з любімай кнігай беларускага аўтара” прапаноўваецца зрабіць сэлфі з беларускай кнігай. Такім чынам будзе зроблена рэклама кнігі і, магчыма, хто-небудзь зацікавіцца ёй. На сайце і ў сацыяльных сетках прадставіць літаратурны хіт-парад “Топ-10” з падборкі твораў на беларускай мове.

Можна аформіць фотазону, на фоне якой прапанаваць не толькі зрабіць цікавыя фотаздымкі, а таксама прыняць удзел у акцыі і напісаць сваё любімае слова на беларускай мове. Міні-акцыя “Далучы сваю далонь” прываблівае жадаючых пакінуць некалькі прыемных слоў пра родную мову.

Для моладзі можна арганізаваць тэматычныя выставы, на якіх будуць прадстаўлены творы беларускай літаратуры за ўвесь час яе існавання – ад мінулага да сучасных дзён. Можна прапанаваць выставу-параду “Моладзь чытае і прапануе”, “Будзь у фармаце – чытай беларускае!”, “Будзь сучасны – чытай беларускае!”, выставу-заклік “Час чытаць кнігі роднай краіны!”, выставу-рэкламу “Свет моладзі: цікава аб розным”.

Сучасным дзецям карысна чытаць беларускія творы. Яны прывіваюць любоў да роднага краю, пашыраюць сферу ўжывання беларускай мовы, выхоўваюць патрыятызм. Далучэнне да роднай мовы развівае пазнавальныя і інтэлектуальныя магчымасці дзяцей, пашырае веды пра беларускую культуру.




З гэтай мэтай дзецям малодшага ўзросту можна прапанаваць паслухаць беларускія народныя казкі, калыханкі, пацешкі, вершы. Таксама азнаёміць іх з прыказкамі і прымаўкамі, загадкамі і скорагаворкамі з дапамогай віктарын і гульняў. Удзельнікам прапануецца паспаборнічаць у эрудыцыі і кемлівасці: скласці часткі вядомых прыказак і прымавак, даведацца пра ўнікальныя беларускія словы, якія адрозніваюць нашу мову ад моў іншых народаў.

Вучням малодшых класаў ёсць сэнс арганізаваць паэтычны марафон “Гучы, беларускае слова!” альбо акцыю “Чытаем разам творы беларускіх пісьменнікаў”, падчас якіх прапанаваць чытаць творы і вершы на беларускай мове. Вучням сярэдняга школьнага ўзросту – хутчэй за ўсіх прачытаць кнігі з

пазакласнага спісу літаратуры, вучням старэйшых класаў прапанаваць напісаць рэцэнзію на беларускую кнігу, якая спадабалася.

Таксама для навучэнцаў сярэдніх школ можна арганізаваць моўны практыкум “Як сказаць па-беларуску”, з дапамогай якога азнаёміць дзяцей з апавяданнямі і вершамі беларускамоўных аўтараў, з выказваннямі пра мову.

Такія мерапрыемствы прымушаюць прысутных думаць, разважаць, аналізаваць. У дзяцей і падлеткаў будзе фарміравацца жаданне вывучаць родную мову, паважаць і берагчы яе, бо, хто паважае сваю мову, той будзе паважаць  і ведаць сваю гісторыю і культуру.

Народная культурная спадчына – галоўная частка сучаснага нацыянальнага мастацкага набытку Беларусі, таму важна не толькі яе зберагаць, але і развіваць, перадаваць новым пакаленням маладых беларусаў. Беларускае дэкаратыўна- прыкладное мастацтва здаўна славіцца сваім знакамітымі і прыгожымі традыцыямі. Тут і беларускі посуд, і нацыянальнае адзенне, ручнікі, знакамітыя паясы, гліняныя цацкі і дзівосныя саламяныя кампазіцыі. З мэтай азнаямлення з рознымі відамі дэкаратыўнага мастацтва, можна прапанаваць адправіцца ў віртуальную вандроўку “Рамёствы зямлі маёй”, падчас якой рассказаць пра разьбу па дрэве, кераміку, кавальства, ткацтва, пляценне, вышыўку і інш.

У бібліятэках арганізаваць імправізаваны куток беларускай хаткі, дзе карыстальнікі могуць азнаёміцца з народнай культурай, жыццём і побытам простага народа: з асаблівасцямі беларускага інтэр’еру, прадметамі народнага побыту, з укладам жыцця сялян. Пры афармленні інтэр’еру выкарыстоўваць элементы беларускай нацыянальнай культуры – тканыя ручнікі, вырабы з дрэва, гліны, пляценне. Уся наглядная агітацыя – назвы кніжных выстаў, цытаты, аб’явы – афармляюцца на роднай мове.




Такім чынам, выкарыстоўваючы розныя метады і формы работы з дзецьмі і падлеткамі, фарміруецца нацыянальная самасвядомасць, пачуццё любові да Радзімы, глыбокае пазнанне спадчыны сваіх продкаў, а праз іх – і далучэнне да нацыянальнай культуры.



***Прыкладны пералік назваў мерапрыемстваў і кніжных выстаў, якія можна выкарыстаць пры арганізацыі масавай работы бібліятэкі:***

*“Адчыні таямніцу роднага краю”;*
*“Староначкі з моўнай скарбоначкі”;*
*“Песня сэрца – мая Беларусь”;*
*“Беларусь мая сінявокая”;*
*“Што стварылі стагоддзі і захавалі нашы продкі”;*
*“Чысты свет народнай культуры”;*
*“У шэрагу вялікіх імёнаў”;*
*“Зямля бацькоў: погляд праз гады”;*
*“Літаратурная палітра пісьменнікаў-юбіляраў”;*
*“Падарожжа па літаратурных сузор’ях”; “Літаратурныя юбілеі”;*
*“Люблю цябе, мая зямля”;*
*“Дзень з беларускім пісьменнікам”;*
*“Жыві, беларускае слова!”;*
*“Падарожжа па кніжнаму сусвету”;*
*“Чыстае слова. Чыстая гаворка”;*
*“Мова. Культура. Маральнасць”;*
*“Родная мова словам класікаў”;*
*“Каб мова родная гучала”;*
*“Да роднай мовы крок зрабі”;*
*“Моўныя скарбы роднага краю”;*
*“Які гэта цуд – мова мая родная!”*
*“Гісторыя беларускай культуры ў асобах, падзеях, фактах”;*
*“Культура ў век глабалізацыі: XXI стагоддзе”;*
*“Кніга як з’ява культуры”;*
*“Адкрый для сябе беларускую кнігу”;*
*“Увага! Навінкі серыі”;*
*“Я – кніжка цікавая”;*
*“Чытай і перадай іншаму”;*
*“Добры дзень, беларуская кніга”;*
*“Каларытнае і трапнае беларускае слова”,*
*“Беларускія казкі – наша спадчына”;*
*“Беларускія пісьменнікі – дзецям”;*
*“Беларускія серыйныя выданні”;*
*“З родным словам, ды з беларускай душою”;*
*“Кніга на роднай мове, якая мяне ўразіла”;*
*“Любімыя кнігі нашай сям'і”;*
*“Пачатак усяму – зямля тваіх бацькоў”;*
*“Мінулае вучыць нас жыць сёння”;*
*“Край свой родны абыду, скарбы розныя знайду”;*
*“Таямніцы беларускай мінуўшчыны”;*
*“Родныя вытокі”.*